Англійская мова для медыяпісьменнасці
Масавы адкрыты анлайн-курс (МООС)

Апісанне курса: "Беларуская мова для медыя-пісьменнасці" – гэта васьмітыднёвы самастойны анлайн-курс з рэгулярнымі анлайн-сесіямі пад кіраўніцтвам прафесійнага выкладчыка англійскай мовы. Курс распрацаваны Дзяржаўным дэпартаментам ЗША і Універсітэтам Пенсільваніі для асоб, якія не з'яўляюцца носьбітамі англійскай мовы, але зацікаўлены ва ўдасканаленні моўных навыкаў і ведаў у галіне сродкаў масавай інфармацыі. Гэты курс дае магчымасць развіць больш шырокае разуменне ролі СМІ ў нашым жыцці, адначасова нарошчваючы слоўнікавы запас і моўныя навыкі, неабходныя для аналізу таго, што мы чытаем і глядзім.

Задачы курса: Па заканчэнні курса ўдзельнікі змогуць аналізаваць інфармацыю, якая з'яўляецца ў медыя-прасторы, ацэньваць станоўчыя і адмоўныя аспекты сацыяльных медыя, вызначаць бягучыя маркетынгавыя стратэгіі, распазнаваць прадузятасць у сродках масавай інфармацыі і аналізаваць прадстаўленне разнастайнасці ў СМІ.

Змест курса: Першы модуль гэтага курса прапануе ўвядзенне ў медыя-пісьменнасць і прадставіць магчымасць ацаніць свой уласны ўзровень медыя-пісьменнасці. У другім блоку вы даведаецеся, як адрозніваць факты ад меркаванняў у СМІ. Наступны блок курса будзе прысвечаны адрозненням паміж сацыяльнымі і традыцыйнымі медыя, у той час як чацвёрты блок будзе прысвечаны таму, як пол і ідэнтычнасць асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі. На апошнім этапе курса вы зможаце прадэманстраваць свае палепшаныя навыкі медыя-пісьменнасці, выконваючы выніковы праект па сацыяльных сетках.

Даты правядзення курса: 14 ліпеня – 1 верасня 2020 г.

Ідэальныя кандыдаты:

Удзельнікі павінны адпавядаць наступным крытэрыям:

- быць грамадзянамі і пастаянна пражываць у Беларусі;

- валодаць англійскай мовай на сярэднім ці вышэйшым за сярэдні ўзроўні (гэта НЕ курс для пачаткоўцаў);

- быць гатовымі ўзяць на сябе абавязацельства выдаткоўваць да 6-8 гадзін штотыдзень на працягу 8 тыдняў;

- быць гатовымі ўдзельнічаць у індывідуальных і групавых анлайн-сесіях, якія будуць праводзіцца мясцовым выкладчыкам англійскай мовы.

Працэс падачы заяўкі: Калі ласка, запоўніце форму па спасылцы https://bit.ly/2YDdQxW да 9 ліпеня 2020 года.

Завяршэнне курса: Удзельнікі, якія паспяхова пройдуць курс, атрымаюць сертыфікат ад Універсітэта Пенсільваніі, а таксама сертыфікат, падпісаны Прэс-клубам Беларусі і Амбасадай ЗША ў Беларусі.